Карамзин не скрывал от читателя подлинного отражения событий в источниках и показал пример, как сухой текст можно превратить в захватывающее произведение. Писатель наполнил свое повествование целым рядом изобразительно-выразительных средств, а также продемонстрировал свое мастерство в выборе нужных слов, ибо «искал души и жизни в тлеющих хартиях» [1, с. 216].

Н. М. Карамзин коренным образом изменил отношение русских людей к истории своего Отечества. После Карамзина русская история стала восприниматься как национальное предание, которое имеет глубокий нравственный и гражданский смысл.

**Литература**

1 Карамзин, Н. М. История государства Российского / Н. М. Карамзин. – М.: Книга, 1988. – 709 с.

***В. А. Караткевіч***
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## УРБАНІСТЫЧНЫЯ МАТЫВЫ Ў ЗБОРНІКУ М. БАГДАНОВІЧА «ВЯНОК»

Адметны для пачатку ХХ ст. характар мае муза Максіма Багдановіча. Яна не ведае спакою і цішы, яна – уся рух і зменлівасць. М. Багдановіч адным з першых пачаў уводзіць у беларускую літаратуру ўрбаністычныя матывы. Прыкладам таму з’яўляецца напісаны пад уражаннем наведвання паэтам Вільні летам 1911-га года цыкл вершаў «Места», што ўвайшоў у зборнік «Вянок». Як эпіграф паэт узяў радкі з верша «Городу» В. Брусава: *«Ты – чарователь неустанный, // Ты – неслабеющий магнит»* [1].

Цыкл М. Багдановіча кампазіцыйна зладжаны і мае ўнутраны сюжэт, у аснове якога скразныя матывы ўсёй лірыкі паэта: каханне, узвышэнне, адраджэнне і смерць. Падкрэсліваючы цэласнасць і кампазіцыйную завершанасць цыкла, зачыннаму вершу аўтар дае назву «Уступ». Далей ідуць такія вершы, як «Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць!», «На глухіх вулках – ноч глухая», «За дахамі места памеркла нябёс пазалота», «У Вільні», «Сеў хлопчык з шкляначкай ля вулічнага ганку», «Ад спёкі пышуць дахі і асфальт», «Дзве смерці». Засяродзім увагу толькі на некаторых вершах, якія найбольш поўна паказваюць нам Вільню тых часоў. Першым, да прыкладу, возьмем верш «Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць!». У ім кожнае слова кранае да глыбіні, чытач адчувае сябе ў эпіцэнтры, дзе ўсё грыміць і блішчыць, дзе нават коні мчацца разам з трамваем, якіх у Вільні ніколі не было. Наступны слупок вядзе ў завулак. Між каменьчыкаў яго пабудоў, дамоў – мох і трава. Гэта Старая Вільня, зусім іншае жыццё, якое існуе ў гэтым механічным гарадскім руху новага горада і часу; існуе там, дзе ўсё толькі пачыналася. У якасці асабліва выразнага прыкладу жыцця горада можна разглядаць санет «У Вільні», дзе паказана, як набягаюць уражанні, імгненна змяняючы адно другое. Тут усё: людзі, будынкі, транспарт. Яны ўключаны ў суцэльны рух, кіпенне і віраванне. А вось у перадапошнім вершы цыклу «Ад спёкі пышуць дахі і асфальт» выражана пачуццё стомленасці горадам, тым напружаннем, якое не дае чалавеку магчымасці прыпыніцца і засяродзіцца на важным. У ім выказана адчайнае і найвялікшае жаданне: *«Хаця бы крышку часу адпачыць!»* [1].

**Літаратура**

1 Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 752 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ